**Ю. ЗАЛАТАЯ**
бібліятэка
Віцебскага
дзяржаўнага
тэхналагічнага
ўніверсітэта

# Бібліятэкі праваслаўных манастыроў Беларусі: позірк у мінулае



«Служебник» Маркава манастыра

**Бібліятэкі вельмі часта называюць скарбніцамі нацыянальнай культуры. І гэта сапраўды так. Усё, што многія стагоддзі захоўвалася ў народнай памяці, знаходзіла адлюстраванне ў кнігах, а кнігі, у першую чаргу найбольш каштоўныя і значныя, збіраліся ў кніжныя калекцыі — бібліятэкі.**

Паказчыкам культурнага развіцця грамадства з'яўляецца яго стаўленне да кнігі, бо без слова, без кнігі няма гісторыі, няма паняцця чалавецтва. У поўнай меры гэта можна аднесці да духоўнай кнігі, якая стала першаасновай літаратуры і пісьменства Беларусі.

Перадумовы з'яўлення бібліятэк на тэрыторыі Беларусі пачалі складвацца з канца IX стагоддзя. Першыя кнігазборы стварыліся пры цэрквах і манастырах.

Праваслаўныя манастыры з`яўляліся асяродкамі асветы і адукацыі. Яны садзейнічалі распаўсюджванню хрысціянскіх кніг. Дзякуючы працы манахаў паступова фарміраваліся манастырскія бібліятэкі. Менавіта ў манастырах з'явілася традыцыя адлюстравання мінулага праз летапісанне.

Першая сярод вядомых нам бібліятэк на тэрыторыі цяперашняй Беларусі была бібліятэка **Полацкага Сафійскага сабора.**

У яе фондзе былі як літургічныя, так і філасофскія сачыненні, біблейскія і новазапаветныя тэксты і кампіляцыі (у тым ліку і апакрыфічныя), гістарычныя працы, летапісы і іншыя літаратурныя помнікі. Захоўваліся ў ёй сачыненні грэцкіх Айцоў царквы на сла-



Жыровіцкае Евангелле

вянскай мове, вялікая частка якіх, па сведчанню летапісаў, была перакладзена на гэтую мову з грэцкага Мяфодзіем і Канстанцінам (у манастве Кірыл). У бібліятэцы Полацкага Сафійскага сабора разам з каштоўнымі кнігамі еўрапейскага паходжання захоўваліся рукапісныя кнігі, створаныя на беларускіх землях, у тым ліку ў скрыпторыі Еўфрасінні Полацкай.

Невялікія бібліятэкі былі створаны і пры збудаваных у XII стагоддзі **Дабравешчанскай царкве** ў Віцебску і **Барысаглебскай царкве** на Каложы ў Гродне.

Самым старажытным і самым славутым праваслаўным манастыром Віцебска быў мужчынскі Свята-Троіцкі Маркаў манастыр.

У фонд бібліятэкі **Свята-Троіцкага Маркава манастыра** ўваходзілі багаслоўскія, павучальныя працы, палемічная літаратура, кнігі па гісторыі, літаратура па пчалярству і земляробству.

У манастырскай бібліятэцы знаходзіліся таксама рукапісы на лацінскай і польскай мовах.

Асаблівую каштоўнасць мелі восем напрастольных Евангелій.

## Манастырскія бібліятэкі — светач любові, дабра, міласэрнасці, адукацыі.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі быў выяўлены *«Служебник»*, які раней належыў Маркаву манастыру.

Бібліятэка **Супрасльскага Дабравешчанскага манастыр**а таксама славілася сваім кніжным багаццем. Супрасльскія манахі ашчадна адносіліся да кніг і сабралі найбагацейшую ў Беларусі бібліятэку.

Да нашых дзён захаваўся цэлы шэраг рукапісных кніг, якія былі прынесеныя ў манастыр манахамі ці былі перапісаныя ў ім у першыя гады яго існавання. Сярод друкаваных кніг было нямала выданняў «друку Скорининского», выданні Івана Фёдарава, мажліва, выданні Ш. Фіёля, маскоўскія кнігі ананімнай тыпаграфіі. Бібліятэка мела ўнікальны экзэмпляр *Цяпінскага «Евангелля»*.



«Евангелле» Цяпінскага



Лаўрышаўскае Евангелле



Застаўка (фрагмент) Лаўрышаўскага Евангелля

Найбольш значнай пасля Супрасля бібліятэкай валодаў Куцеінскі манастыр ля Оршы. Куцеінскі манастыр быў цэнтрам беларускай асветы, беларускага кірылічнага друкавання. Сотні тамоў налічвала Куцеінская бібліятэка, сярод якіх было шмат кніг з друкарняў Кіева, Масквы, Чарнігава, Еўні, Буйнічаў. Верагодна, што ў бібліятэцы захоўваўся выдатны помнік старажытнага беларускага пісьменства XIII стагоддзя — *Аршанскае Евангелле.*

Бібліятэка Жыровіцкага Успенскага манастыра — адна з буйнейшых манастырскіх бібліятэк.



Аршанскае Евангелле XIII ст.

Гісторыя стварэння бібліятэкі звязана з родам магнатаў Солтанаў. З'яўляючыся, відавочна, чалавекам адукаваным, Солтан Аляксандравіч заснаваў у сваім маёнтку Шышкін пад Вільняй скрыпторый. Тут перапісваліся кнігі богаслужэбнага зместу. Скрыпторый дзейнічаў і пасля яго смерці. Нашчадкі Солтана збіралі разнастайныя кнігі, у тым ліку друкаваныя, выраб якіх усё больш наладжваўся ў Рэчы Паспалітай. Так быў пакладзены пачатак будучай бібліятэкі.

Знакамітым помнікам **Жыровіцкага Успенскага манастыра** з'яўляецца *Жыровіцкае Евангелле*.

На працягу стагоддзяў складаліся фонды бібліятэкі **Лаўрышаўскага манастыра** — аднаго з найстаражытнейшых беларускіх манастыроў, гісторыя якога малавядомая і загадкавая, як, зрэшты, і гісторыя большасці помнікаў культуры Беларусі. Аб ім часцей за ўсё ўзгадваюць у сувязі з добра захаваным пергаментным Евангеллем, названым *Лаўрышаўскім*.

Духоўная кніга вельмі важна ў наш час! Менавіта яна выхоўвае ў людзей дабро, веру, міласэрнасць. Любоў да кнігі заўсёды была адметнай рысай праваслаўнага чалавека, бо ўсялякая кніга, якая змяшчае хрысціянскае веравучэнне, — бачнае ўвасабленне Адкрыцця Божага.

Манастырскія бібліятэкі — светач любові, дабра, міласэрнасці, адукацыі. Вельмі важна захаваць і не страціць гэтыя скарбніцы, якія спрыялі і спрыяюць духоўнаму і асветніцкаму развіццю Беларусі.